Газета Беларускага дзяржаўнага ўніверсітэта

www.gazeta.bsu.by

УНІВЕРСІТЭТ

Пераможца V Нацыянальнага конкурсу друкаваных СМІ «Залатая літара» ў намінацыі «Найлепшая шматтыражная газета»

19 сакавіка 2018 года, № 5 (2192)

УРАЧЫСТАСЦІ

Фота Васіля КУЗЬМЕНКІНА

Каштоўныя якасці

Напярэдадні Міжнароднага жаночага дня рэктар **Андрэй Кароль** сустрэўся з прадстаўніцамі Савета маладых навукоўцаў БДУ.

На ўрачысты прыём, прысвечаны святу 8 Сакавіка, запрасілі 45 супрацоўніц, якія дамагліся значных вынікаў у навуковай дзейнасці. У іх ліку аспіранты, старшыя выкладчыкі, кандыдаты навук усіх факультэтаў і інстытутаў БДУ. Пра асноўныя іх прафесійныя дасягненні было расказана ў відэапрэзентацыі.

Цёплыя словы адрасаваў маладым навукоўцам рэктар БДУ **Андрэй Кароль**. У сваім прывітанні ён пажадаў ім знаходзіць разумны баланс паміж прафесійнай дзейнасцю і сямейнымі абавязкамі, бо гэта важныя складнікі жыцця кожнай жанчыны. «Хай вашы родныя і блізкія не адчуваюць дыскамфорту ад вашай адказнай і значнай навуковай дзейнасці», – падкрэсліў рэктар.

Віншаванні ўдзельніцам сустрэчы таксама прагучалі ад прарэктара па навуковай рабоце **Васіля Сафонава**, прарэктара па вучэбнай рабоце і інтэрнацыяналізацыі адукацыі **Сяргея Ходзіна**, прарэктара па вучэбнай рабоце і адукацыйных інавацыях **Вольгі Чупрыс**, прарэктара па эканоміцы і матэрыяльна-тэхнічным развіцці **Міхаіла Чарапеннікава**, прарэктара па выхаваўчай рабоце і сацыяльных пытаннях **Івана Янушэвіча** і старшыні прафкама работнікаў БДУ **Ігара Вярэнчыкава**.

Фармат мерапрыемства дазволіў маладым навукоўцам бліжэй пазнаёміцца з калегамі з іншых факультэтаў, абмяняцца досведам і кантактамі. Старшыня Савета маладых навукоўцаў дацэнт кафедры міжнароднага прыватнага і еўрапейскага права ФМА **Наталля Анцух** ад імя арганізацыі падзякавала кіраўніцтву БДУ за прызнанне дзейнасці савета, высокую ацэнку навуковай працы кожнай яго прадстаўніцы. У сваю чаргу рэктар Андрэй Кароль дадаў, што ўсе члены рэктарата адкрыты да дыялогу, абмеркавання цікавых прапаноў і ініцыятыў савета.

Для жанчын была падрыхтавана святочная музычная праграма.

Алена МАРЦУЛЕВІЧ

Савет маладых навукоўцаў БДУ створаны ва ўніверсітэце ў 2009 г. Яго дзейнасць заклікана спрыяць прафесійнаму росту маладых навукоўцаў, іх актыўнаму ўдзелу ў фундаментальных і прыкладных даследаваннях, праграмах і розных фондах. Маладымі навукоўцамі прызнаюцца навуковыя і навукова-педагагічныя работнікі, аспіранты і дактаранты БДУ, якія не дасягнулі 35 гадоў.

У нумары:

ЭКСПАРТ ПАСЛУГ – АГУЛЬНАЯ СПРАВА
Рэктар БДУ Андрэй Кароль разам з членамі рэктарата наведаў гістарычны факультэт і ІБМТ, дзе быў прыняты шэраг стратэгічных рашэнняў
Стар. 2

З УНІВЕРСІТЭТА – НА ПРАЦУ
Цэнтр кар'еры БДУ праводзіць для студэнтаў практыкум па пошуку працы
Стар. 4

АДЗІН ЗА АДНЫМ
Завяршылася маштабная літаратурная эстафета БДУ ў падтрымку рэспубліканскага конкурсу «Чытаем па-беларуску»
Стар. 6

Весткі з рэктарата

РЭКТАР Вышэйшай школы падрыхтоўкі кадраў дзяржавы і ўраду Кубы **Мэрсэдэс Дэльгада Фернандэс** 15 сакавіка наведала БДУ.

На сустрэчы з рэктарам БДУ **Андрэем Каралём**, прарэктарам па навучальнай працы і інтэрнацыяналізацыі адукацыі **Сяргеем Ходзіным** госцю азнаёмілі з дзейнасцю і структурай БДУ, а таксама з пазіцыямі ў міжнародных рэйтынгах. Бакі азначылі партнёрскую карту, змест якой можа быць напоўнены высокатэхналагічнымі праектамі, навуковай працай і сумеснай падрыхтоўкай кадраў для сферы, звязанай з кіраўнічай дзейнасцю.

ПАМОЧНІКАМ рэктара прызначана **Кацярына Бяспанская-Паўленка**.

Кацярына Дзмітрыеўна нарадзілася ў 1976 г. у Мінску, кандыдат псіхалагічных навук.

У 1999 г. скончыла з адзнакай БДПУ імя М. Танка па спецыяльнасці «Практычная псіхалогія. Замежная мова (нямецкая)». У 1999–2004 гг. працавала на кафедры ўзроставай і педагагічнай псіхалогіі БДПУ. З 2004 г. па сакавік 2018 г. у БДУ на кафедры агульнай і клінічнай псіхалогіі факультэта сацыякультурных камунікацый. Мае больш за 100 навуковых і навучальна-метадычных публікацый. Замужам, мае сына.

Паводле інфармацыі прэс-службы БДУ

Каб скарыстацца мультымедыйным кантэнтам газеты:

1. *Загрузіце на смартфон прыкладанне* ***HP Reveal***
2. *Падпішыцеся на канал* ***#bsuby***
3. *Навядзіце камеру на выяву з пазнакай*

З ПЕРШЫХ КРЫНІЦ

Экспарт паслуг – агульная справа

Новыя рашэнні па развіцці дзейнасці комплексу БДУ прыняты па выніках наведвання гістарычнага факультэта рэктарам **Андрэем Каралём.**

Фота Васіля КУЗЬМІНКІНА

Дэкан гістфака Аляксандр Каханоўскі распавёў пра напрамкі развіцця факультэта

Адбылася сустрэча з кіраўніцтвам факультэта і кафедрамі, а таксама з членамі савета і прафесарска-выкладчыцкім складам. Удзельнікамі мерапрыемства таксама сталі прарэктары **Вольга Чупрыс, Сяргей Ходзін, Васіль Сафонаў,** а таксама начальнік ГУН **Віталь Кутавічус,** начальнік ГУБУіФ **Таццяна Каўшэвіч** і начальнік упраўлення кадраў **Наталля Няпеўная.**

Вектар дыялогу прадстаўнікоў рэктарата і факультэта быў накіраваны на дэталёвую прапрацоўку актуальных пытанняў у разрэзе стратэгічнага развіцця ўсяго БДУ. Так, у дачыненні тэмы экспарту паслуг калегіяльна было прынята рашэнне пра ажыццяўленне ў БДУ на платнай аснове ўсіх відаў паслуг у залежнасці ад профілю падраздзяленняў. Адпаведнае распараджэнне рэктара, алгарытм і інструкцыю ўзаемадзеяння з заказчыкам у найбліжэйшым часе пададуць усяму комплексу ВНУ. Дадзены працэс будзе адрэгуляваны па прынцыпе «аднаго акна».

У галіне манетызацыі дзейнасці факультэта таксама разгледзелі пытанне іміджавага складніка. Было адзначана, што на недастатковым інфармацыйным узроўні прадстаўлены вынікі адукацыйна-навуковай працы. «Усім факультэтам неабходна паказваць свой патэнцыял заказчыкам», – падкрэсліў рэктар БДУ Андрэй Кароль. Рашэннем стала прапанова падрыхтаваць іміджавыя ролікі пра магчымасці і паслугі падраздзялення. Структураваная інфармацыя дазволіць прыцягнуць патэнцыйнага абітурыента і заказчыка. Для працы з замежнымі студэнтамі рэкамендавана распрацаваць «візітныя карткі» спецыяльнасцяў на англійскай мове, якія адлюстроўваюць змест дысцыплін, колькасць гадзін і вынікі.

Падчас сустрэчы быў адзначаны асаблівы статус факультэта, які мае розныя навукова-адукацыйныя магчымасці. Рэктар звярнуўся да навукоўцаў з прапановай прапрацаваць пытанне навуковага асэнсавання ролі БДУ ў развіцці нацыянальнай адукацыі і навукі. Атрыманыя вынікі могуць стаць падставай для правядзення маштабнай тэматычнай канферэнцыі.

Удзельнікі разгледзелі пытанні, якія тычацца ўвядзення ў сацыяльна-гуманітарны блок дысцыпліны «Універсітэтазнаўства», магістарскіх праграм на англійскай мове, укаранення новых методык выкладання. Членам рэктарата прадэманстравалі практычны вынік сумеснай працы студэнтаў і выкладчыкаў. На факультэце запушчана звыш 80 тэматычных электронных праектаў. Дадзены напрамак кіраўніцтва БДУ высока ацаніла і рэкамендавала развіваць узаемадзеянне паміж удзельнікамі навучальнага працэсу. Вынікі такой працы, а таксама найлепшыя інавацыйныя методыкі размесцяць на *міжуніверсітэцкім адукацыйным партале «Метадалогія, змест, практыка крэатыўнай адукацыі»*, які плануюць запусціць у БДУ.

Таксама члены рэктарата пазнаёміліся з матэрыяльна-тэхнічнай базай гістарычнага факультэта, наведалі музей, навучальныя аўдыторыі і кафедры. Музей мае ўнікальную калекцыю манет і археалагічных знаходак. Плануецца скласці каталог экспанатаў, які адпавядае сусветным стандартам. Гэта дапаможа вывесці працу музея на якасна новы ўзровень.

Алена МАРЦУЛЕВІЧ

З ПЕРШЫХ КРЫНІЦ

Курс на аптымізацыю эканамічных спецыяльнасцяў

Пытанні далейшага развіцця Інстытута бізнесу і менеджменту тэхналогій БДУ былі разгледжаны ў рамках працоўнага візіту рэктара **Андрэя Караля** ў дадзеную ўстанову.

Адбылася сустрэча з кіраўніцтвам, загадчыкамі кафедраў, членамі савета і прафесарска-выкладчыцкім складам інстытута. Удзельнікамі мерапрыемства сталі таксама члены рэктарата БДУ.

На пачатку мерапрыемства калектыву ІБМТ быў прадстаўлены выканаўца абавязкаў дырэктара **Анатоль Кавалінскі,** а таксама названы прычыны змены кіраўніцтва інстытута.

Сустрэча прайшла ў фармаце канструктыўнага дыялогу і грунтавалася на аналізе прагнозна-аналітычных матэрыялаў, прадстаўленых інстытутам. Былі адзначаны моцныя і слабыя бакі працы структуры. Паказальным момантам з'яўляецца праца з заказчыкамі кадраў, і адзначана неабходнасць паляпшэння якасці адукацыі. У разрэзе гэтай праблемы калектыў інстытута падтрымаў ініцыятыву рэктарата па аптымізацыі эканамічных спецыяльнасцяў на шэрагу факультэтаў і інстытутаў з мэтай узмацнення канкурэнтных пераваг падрыхтоўкі ў БДУ.

У ліку прыярытэтных тэм стала абмеркаванне экспарту адукацыйных паслуг. Паляпшэнне паказчыкаў у гэтым напрамку бачыцца ў развіцці дыстанцыйнага навучання, што дазволіла б прыцягнуць большую колькасць замежных студэнтаў. Удзельнікі сустрэчы разгледзелі дадзенае пытанне ў плоскасці дыдактычнага і тэхнічнага кампанентаў. «Неабходны навуковы падыход у вызначэнні ролі дыстанцыйнага навучання. Досвед ІБМТ у гэтай галіне заслугоўвае ўвагі. Важна, каб ад манетызацыі не пакутавала якасць. БДУ павінен стаць лідарам на еўразійскай прасторы па аказанні дыстанцыйных адукацыйных паслуг», – адзначыў рэктар БДУ Андрэй Кароль.

Загадчыкі кафедраў таксама актуалізавалі пытанні, якія тычацца кантрольных лічбаў прыёму ў інстытут, новаўвядзенняў у паступленні замежных грамадзян у магістратуру, узмацнення практыка-арыентаванага навучання. У сувязі з гэтым кіраўніцтву ІБМТ было даручана распрацаваць у найбліжэйшы час план далейшага развіцця інстытута ў адпаведнасці са стратэгічнымі задачамі БДУ. У дакуменце неабходна прапісаць мэты, механізмы іх дасягнення, выніковы прадукт дзейнасці, з указаннем тэрмінаў выканання і фінансавых запатрабаванняў.

Увага рэктарата была звернутая таксама на складанасці засялення ў інтэрнаты замежных студэнтаў. З мэтай спрашчэння гэтага працэсу прынята калегіяльнае рашэнне распрацаваць адзіны алгарытм для ўсіх факультэтаў і інстытутаў па папярэднім інфармаванні службаў БДУ па засяленні замежных грамадзян у інтэрнаты ВНУ.

Рэктар БДУ Андрэй Кароль адзначыў змястоўнасць і карыснасць дыялогу для ўсіх удзельнікаў сустрэчы. Ён выказаў спадзяванне, што кансалідацыя карпаратыўных каштоўнасцяў ІБМТ і БДУ толькі ўзмоцніцца, што паспрыяе развіццю ўсяго комплексу ўніверсітэта.

Візіт прайшоў у рамках працоўных сустрэч рэктара з прадстаўнікамі факультэтаў і інстытутаў ВНУ. Дадзеныя мерапрыемствы дазваляюць пазнаёміцца з супрацоўнікамі, калегіяльна прааналізаваць праблемы і шляхі іх рашэння, а таксама вызначыцца з далейшым шляхам развіцця структуры і ўніверсітэта ў цэлым.

Алена МАРЦУЛЕВІЧ

ВАЖНЫЯ РАШЭННІ

Трэба павысіць паспяховасць студэнтаў

Пашыранае пасяджэнне рэктарата прайшло 15 сакавіка ў БДУ.

З інфармацыяй пра вынікі зімовай экзаменацыйнай сесіі ў 2017–2018 навучальным годзе выступіла начальнік ГУВНМР **Людміла Хухлындзіна**. Акцэнт быў зроблены на станоўчых і адмоўных тэндэнцыях атрыманых вынікаў аналізу зімовай сесіі. Была адзначана станоўчая тэндэнцыя росту абсалютнай паспяховасці ў параўнанні з паказчыкамі мінулых гадоў. Аднак запланаваны паказчык па комплексе БДУ пакуль яшчэ не дасягнуты. Асобным факультэтах было рэкамендавана прааналізаваць зніжэнне колькасці паспяваючых студэнтаў і распрацаваць прапановы па паляпшэнні сітуацыі.

Было прынята рашэнне аб распрацоўцы карэктуючых дзеянняў для факультэтаў па павышэнні паспяховасці навучэнцаў. У прыватнасці, у найбліжэйшы час на факультэтах неабходна ўкараніць шэраг мерапрыемстваў, накіраваных на пашырэнне дадатковых адукацыйных паслуг для студэнтаў, а таксама правесці дыягностыку педагагічнай матывацыі выкладчыкаў на падтрыманне якасці навучання.

Удзельнікі пасяджэння таксама абмеркавалі пытанні, якія тычацца бягучага матэрыяльна-тэхнічнага стану вучэбных карпусоў і этычнага ўзроўню студэнтаў і выкладчыкаў. Было прынята рашэнне ў найбліжэйшы час абнавіць стэндавыя канструкцыі на факультэтах, замяніць кафедральныя таблічкі і актуалізаваць стэндавую інфармацыю. Для вырашэння пытанняў, якія тычацца этычных нормаў паводзінаў у навучальнай установе, было прынята стварыць камісію па распрацоўцы этычнага кодэкса БДУ.

НАВАЦЫІ

Фота Васіля КУЗЬМІЧКІНА

Удзельнікі эўрыстычнага аргдзейнаснага курса «Методыка навучання праз адкрыццё: як навучаць усіх па-рознаму, але аднолькава»

Методыка навучання праз адкрыццё

Пасведчанні аб павышэнні кваліфікацыі выкладчыкаў у галіне крэатыўнай адукацыі ўручаны выкладчыкам БДУ. Урачыстая цырымонія адбылася 6 сакавіка ў БДУ.

Ва ўзнагароджанні прынялі ўдзел рэктар **Андрэй Кароль,** дэкан факультэта павышэння кваліфікацыі і перападрыхтоўкі Інстытута журналістыкі **Ганна Басава.**

Рэктар Андрэй Кароль падвёў вынікі правядзення вочна-дыстанцыйнага аргдзейнаснага курса «Методыка навучання праз адкрыццё: як навучаць усіх па-рознаму, але аднолькава» і падзяліўся бачаннем яго далейшага развіцця і ўкаранення атрыманых вынікаў. Ён адзначыў неабходнасць рэалізацыі ў навучальным працэсе найлепшых інавацыйных распрацовак, якія прадставілі ўдзельнікі курса. Таксама актуальнае пытанне стварэння навукова-метадычнай базы, якая змяшчае прыклады адкрытых заданняў, эўрыстычных заняткаў, інтэрнэт-заняткаў. Яшчэ адзін з напрамкаў звязаны з фарміраваннем працоўнай групы па арганізацыі нарматыўна-прававой базы. Вынікамі яе працы стануць рэкамендацыі і прапановы для РІВШ і Міністэрства адукацыі, якія тычацца пытанняў стандартаў, праграм, а таксама правядзення дыстанцыйнага навучання ў БДУ.

Усяго ўладальнікамі дакументаў, якія пацвярджаюць паспяховае заканчэнне вочна-дыстанцыйнага аргдзейнаснага курса «Методыка навучання праз адкрыццё: як навучаць усіх па-рознаму, але аднолькава», сталі 67 супрацоўнікаў БДУ, Ліцэя і Юрыдычнага каледжа ВНУ. Таксама сертыфікаты аб удзеле ў вочна-дыстанцыйным аргдзейнасным курсе атрымалі 17 выкладчыкаў ГрДУ імя Янкі Купалы.

Аўтарам і вядучым курса з'яўляецца рэктар БДУ Андрэй Кароль. Дадзены курс акумулюе больш як 20-гадовы навуковы досвед і веды ў галіне эўрыстычнага навучання, арыентаванага на творчую самарэалізацыю і індывідуалізацыю навучання студэнтаў і школьнікаў (навуковая школа чалавекаадпаведнай адукацыі А. У. Хутарскога). Дадзены курс накіраваны на развіццё эўрыстычных якасцяў асобы педагога, здольнага індывідуалізаваць працэс навучання школьнікаў і студэнтаў.

У рамках курса прайшлі тры семінары: «Ці можна навучаць усіх па-рознаму, але аднолькава? Як распрацаваць адкрытае (эўрыстычнае) заданне»; «Як распрацаваць і правесці занятак эўрыстычнага тыпу»; «Як праектаваць і правесці эўрыстычны інтэрнэт-занятак».

Нагадаем, удзельнікамі курса павышэння кваліфікацыі сталі каля 150 педагогаў і выкладчыкаў БДУ, ГрДУ імя Янкі Купалы, РІВШ, Ліцэя БДУ і чатырох каледжаў. Размовы, дыскусіі і абмеркаванні праходзілі ў рэжыме анлайн. Такая форма аб'яднала ключавыя звёны ўсіх ступеняў адукацыі – агульную сярэднюю, сярэднюю спецыяльную і вышэйшую.

У найбліжэйшы час найлепшыя інавацыйныя прапановы, у ліку якіх распрацаваныя ў рамках курса эўрыстычныя заданні, заняткі і анлайн-заняткі, будуць апублікаваны на міжуніверсітэцкім інтэрнэт-партале «Метадалогія, змест, практыка крэатыўнай адукацыі XXI стагоддзя» ці ў новай серыі навучальных дапаможнікаў «Крэатыўная адукацыя».

Плануецца таксама ажыццявіць новы набор на курс «Методыка навучання праз адкрыццё: як навучаць усіх па-рознаму, але аднолькава». Слухачамі могуць стаць усе ахвотныя выкладчыкі БДУ. Заяўкі прымаюцца на электронным адрасе: ***innlab@bsu.by.*** Пачатак навучання: па меры фарміравання.

Алена МАРЦУЛЕВІЧ

СУПРАЦОЎНІЦТВА

Віды на Турцыю

Інфармацыйна-адукацыйны цэнтр БДУ адкрыты ў Анкары (Турцыя). Дзейнічае ён на базе офіса адукацыйнай кампаніі «Атлас» (Atlas private educational services), а працу з беларускага боку каардынуе факультэт даўніверсітэцкай адукацыі БДУ.

Функцыянаванне цэнтра дазволіць умацаваць адукацыйныя і культурныя сувязі паміж установамі вышэйшай адукацыі Беларусі і Турцыі, а таксама значна спросціць абмен інфармацыяй аб адукацыйных паслугах БДУ. Цэнтр будзе аказваць кансультацыйныя паслугі па паступленні ў БДУ і ў іншыя беларускія ўніверсітэты. У перспектыве плануецца на базе цэнтра адкрыць курсы рускай мовы як замежнай для турэцкіх грамадзян.

Ва ўрачыстай цырымоніі адкрыцця прынялі ўдзел Надзвычайны і Паўнамоцны Пасол Рэспублікі Беларусь у Турэцкай Рэспубліцы **Андрэй Савіных**, генеральны менеджар кампаніі «Атлас» **Місуд Ілмаз**, намеснік дэкана ФДА БДУ **Аляксандр Жук**, дырэктар інфармацыйна-адукацыйнага цэнтра БДУ ў Турэцкай Рэспубліцы **Джэнк Саркут**.

У рамках візіту ў Турцыю дэлегацыя БДУ прыняла ўдзел у міжнароднай адукацыйнай выставе A2 International Education Fairs of Turkey, якая праходзіць на рэгулярнай аснове ў шэрагу гарадоў Турцыі, Азербайджана, Казахстана. Дадзеная выстава з'яўляецца адным з найважнейшых мерапрыемстваў у Цэнтральна-Азіяцкім рэгіёне па рэкламе і прасоўванні адукацыйных паслуг універсітэтаў на міжнародным рынку ў Азіі і на Блізкім Усходзе. БДУ падрыхтаваў інфармацыйна-даведачны стэнд з інфармацыяй пра адукацыйную дзейнасць ВНУ, спецыяльнасці і спецыялізацыі, правілы прыёму замежных грамадзян. Рэкламны пакет раздатачных матэрыялаў, а таксама прэзентацыйны ролік пра БДУ былі прадстаўлены на турэцкай і англійскай мовах. Вынікам удзелу беларускай ВНУ ў выставе стала правядзенне больш чым 100 інтэрв'ю з зацікаўленымі ў навучанні ў БДУ абітурыентамі. Адзначым, 40% з іх атрымалі інфармацыю пра паступленне ў аспірантуру, а 60% звярнуліся па інфармацыю пра навучанне на факультэтах і ў магістратуры на англійскай мове.

У выставе прынялі ўдзел больш за 100 нацыянальных, замежных і міжнародных арганізацый з 20 краін. Установы адукацыі прэзентавалі навучальныя праграмы, курсы павышэння кваліфікацыі, моўныя школы і інш.

Даведка

Atlas private educational services – міжнародная адукацыйная кампанія, якая ажыццяўляе сваю дзейнасць з 1990 года. У наш час з'яўляецца афіцыйным прадстаўніком больш чым 500 універсітэтаў, каледжаў і моўных школ свету, а офісы размешчаны ў Вялікабрытаніі, Аўстраліі, Турцыі і Украіне.

У 2014 годзе Atlas па версіі Study travel magazine прызнаны найлепшым адукацыйным агенцтвам Усходняй Еўропы. Кампанія каардынуе на ўсіх этапах паступленне замежных грамадзян у замежныя адукацыйныя ўстановы.

АБ'ЯВЫ

ІНСТЫТУТ ТЭАЛОГІІ ІМЯ СВЯТЫХ МЯФОДЗІЯ І КІРЫЛА БДУ
АБ'ЯЎЛЯЕ КОНКУРС НА ЗАМЯШЧЭННЕ ПАСАД:

ПРАФЕСАРАЎ КАФЕДРАЎ біблеістыкі і хрысціянскага веравучэння.

Тэрмін конкурсу – адзін месяц з дня апублікавання аб'явы. Адрас: 220030, г. Мінск, пр. Незалежнасці, 24, каб. 209, тэл. +375 17 327 55 71.

БЕЛАРУСКІ ДЗЯРЖАЎНЫ ЎНІВЕРСІТЭТ
АБ'ЯЎЛЯЕ КОНКУРС НА ЗАМЯШЧЭННЕ ПАСАД:

ЗАГАДЧЫКАЎ КАФЕДРАЎ: агульнай хіміі і методыкі выкладання хіміі; класічнай філалогіі.

ПРАФЕСАРАЎ КАФЕДРАЎ: гісторыі Расіі; міжнародных адносін.

ДАЦЭНТАЎ КАФЕДРАЎ: заалогіі; інфармацыйных сістэм кіравання; вышэйшай матэматыкі; матэматычнага мадэлявання і аналізу дадзеных; тэарэтычнай фізікі і астрафізікі; стылістыкі і літаратурнага рэдагавання; літаратурна-мастацкай крытыкі; аналітычнай хіміі; высокамалекулярных злучэнняў; агульнай хіміі і методыкі выкладання хіміі; тэлекамунікацый і інфармацыйных тэхналогій; вэб-тэхналогій і камп'ютарнага мадэлявання; геаметрыі, тапалогіі і методыкі выкладання матэматыкі; функцыянальнага аналізу і аналітычнай эканомікі; сучаснай беларускай мовы; тэорыі і методыкі выкладання рускай мовы як замежнай; англійскай мовы гуманітарных спецыяльнасцяў; тэарэтычнай і інстытуцыянальнай эканомікі; філасофіі і метадалогіі навукі; філасофіі культуры; дызайну; інфармацыйных тэхналогій.

СТАРШЫХ ВЫКЛАДЧЫКАЎ КАФЕДРАЎ: англійскай мовы прыродазнаўчых факультэтаў; інфармацыйных сістэм кіравання; дыскрэтнай матэматыкі і алгарытмікі; фізічнай оптыкі і прыкладной інфарматыкі; гісторыі журналістыкі і менеджменту СМІ; тэхналогій камунікацый; літаратурна-мастацкай крытыкі; тэлебачання і радыёвяшчання; аналітычнай хіміі; тэлекамунікацый і інфармацыйных тэхналогій; фізічнага выхавання і спорту; геаметрыі, тапалогіі і методыкі выкладання матэматыкі; вэб-тэхналогій і камп'ютарнага мадэлявання; рускай мовы; эканамічнай тэорыі; мовазнаўства і краіназнаўства Усходу; мытнай справы; германскіх моў; англійскай мовы гуманітарных спецыяльнасцяў; англійскай мовы эканамічных спецыяльнасцяў; тэарэтычнай і інстытуцыянальнай эканомікі; агульнай і клінічнай псіхалогіі; менеджменту і эканомікі сацыяльнай сферы; камп'ютарнай лінгвістыкі і лінгвадыдактыкі; інфармацыйных тэхналогій; тэорыі і практыкі перакладу.

ВЫКЛАДЧЫКАЎ КАФЕДРАЎ: англійскай мовы і моўнай камунікацыі; фізічнага выхавання і спорту.

Тэрмін конкурсу – адзін месяц з дня апублікавання аб'явы.

Адрас: 220030, г. Мінск, вул. Бабруйская, 5а, упраўленне кадраў, тэл. 209-54-36.

БДУ Ў СМІ Беларусі

Семінар маладых літаратараў «Першацвет» прайшоў на філалагічным факультэце БДУ – zviazda.by (26.02), mininform.gov.by, wuz.by (28.02), БелТА (01.03).

Двухдзённая Беларуская студэнцкая юрыдычная алімпіяда адкрылася 2 сакавіка ў БДУ – pravo.by (02.03), belnotary.by (06.03), jurist.by (07.03).

«Золата» навукова-інжынернага конкурсу навучэнцаў Belarus Science and Engineering Fair–2018 заваявалі ліцэісты БДУ – БелТА (03.03), sb.by, «СБ-Беларусь сёння» (05.03), zviazda.by (11.03).

Пра 72-гадовага выпускніка Інстытута журналістыкі БДУ Сямёна Елізарава – «Мінскі кур'ер», mk.by (06.03), «Мінск-навіны», kp.by, tut.by (11.03).

Інфармацыйна-адукацыйны цэнтр БДУ адкрыўся ў Анкары – БелТА, 21.by (12.03), zviazda.by, ecopress.by (13.03).

Студэнты ДІКСТ БДУ ўпершыню прадставілі калекцыю адзення «100 гукаў вясны» – БелТА (05.03), wuz.by (06.03), СТБ (07.03).

Паводле інфармацыі прэс-службы БДУ

РАЗМЕРКАВАННЕ

З універсітэта – на працу

Студэнты вучацца будаваць кар’еру з нуля

Пошук першага месца працы для многіх маладых спецыялістаў – сапраўднае выпрабаванне. Выяўляецца няўменне правільна скласці рэзюмэ, прэзентаваць сябе і, вядома, адсутнасць досведу. Як з сумам жартуюць выпускнікі, а дзе гэты досвед узяць, калі без яго на працу не бяруць. Знайсці выйсце прапануе **цэнтр кар’еры БДУ**, які праводзіць для студэнтаў практыкум «Пошук працы», дзе кожны ахвотнік можа не толькі атрымаць неабходныя для пабудовы кар’еры веды, але і прайсці рэальнае сумоўе, не выходзячы з аўдыторыі.

– Мы шукаем любыя шляхі ўзаемадзеяння з заказчыкамі кадраў, з працадаўцамі для таго, каб працаўладкаваць нашых студэнтаў, – распавядае намеснік начальніка ўпраўлення кадраў БДУ **Вераніка Дабравольская.** – Ідэя гэтага практыкума з’явілася дзякуючы начальніку нашага ўпраўлення **Наталлі Няпеўнай,** якая заўсёды глядзіць наперад і разумее, што выпускнікам трэба дапамагаць, у тым ліку паказваць, як выбудоўваць свае адносіны з будучымі працадаўцамі, з кампаніямі.

Практыкум складаецца з лекцыйных і практычных заняткаў, якія праводзіць запрошаны выкладчык **Сяргей Бакулін,** кіраўнік праекта kandidat.by, спецыяліст у галіне падбору персаналу. Ён дзеліцца з удзельнікамі актуальнай інфармацыяй пра рынак працы, распавядае пра каналы пошуку вакансій і нюансы таго, як скласці рэзюмэ, калі няма досведу працы:

– Працадаўца не заўсёды шукае чалавека з досведам, часта ён у пошуку супрацоўніка, які блізкі яму па духу, падыходзіць па нейкіх асабістых якасцях і гатовы працаваць над нейкай ідэяй ці праектам. Гэтым крытэрыям можа адпавядаць і студэнт, таму я раю выпускнікам адгукацца на вакансіі, нават калі няма адпаведнага досведу працы, бо нават у гэтым выпадку можна паказаць сябе, – тлумачыць спецыяліст. – На працягу

Сумоўе праводзяць HR-спецыялісты

вучобы ва ўніверсітэце студэнты выконваюць шэраг праектаў, прычым досыць паспяхова, у іх ёсць нейкія напрацоўкі, якія самі студэнты не заўсёды ўспрымаюць як дасягненне, але насамрэч яны могуць быць вельмі важныя для працадаўцы, галоўнае – пісьменна падаць гэту інфармацыю. Студэнтам, у якіх сапраўды ўжо ёсць некаторыя веды і кампетэнцыі, трэба вучыцца пахваліць сябе ў патрэбны момант, падкрэсліць свае перавагі.

Пасля тэорыі студэнтам прапануюць перайсці да самай важнай часткі заняткаў – практыкі. Бо можна актыўна высылаць кампаніям рэзюмэ і нават атрымліваць запрашэнні на сумоўі, але ўсё адно чуць фразу «мы вам ператэлефануем».

– Часцей за ўсё адмовы бываюць таму, што чалавек не ведае пэўных правілаў паводзін на сумоўі, не ўмее выгадна сябе прадставіць або не разумее, што існуюць вакансіі з нізкім парогам патрабаванняў, таму на іх адгукаецца вельмі вялікая колькасць людзей, і тут трэба ўмець вылучыцца на фоне іншых, – кажа Сяргей Бакулін.

На рэальных сумоўях, як правіла, ніхто не будзе тлумачыць прычыну адмовы і тым больш – разбіраць вашы памылкі. Таму, каб не набіваць гузоў раней часу, удзельнікам прапануюць падрыхтавацца: да практычных заняткаў, напрыклад, яны знаходзяць цікавыя для іх вакансіі і складаюць пад іх рэзюмэ, а наколькі яны адпавядаюць адзін аднаму, правярае выкладчык і паказвае на месцы, што патрабуюць карэкціроўкі.

Своеасаблівым іспытам для тых, хто засвоіў курс, з’яўляецца speed-meeting: HR-спецыяліст таго сегмента рынку працы, які адпавядае спецыяльнасці ўдзельнікаў, студэнт у якасці кандыдата, і пяць хвілін на самапрэзентацыю – умовы максімальна набліжаныя да рэальных. Унікальнасць такіх сумоўяў у тым, што ў выніку інтэрв’ю студэнт абавязкова атрымае зваротную сувязь ад спецыяліста. Даведацца, як гэта працуе, мы адправіліся на ***speed-meeting*** да студэнтаў факультэта радыёфізікі і камп’ютарных тэхналогій. Да іх, дарэчы, прыйшлі два рэкрутара – выдатная магчымасць пераканацца, што ў кожнага спецыяліста свае падыходы да правядзення інтэрв’ю, якія могуць залежаць нават ад карпаратыўнай культуры кампаніі. З аўдыторыі пасля сумоўя з адным з рэкрутараў выходзіць студэнт 4 курса ФРКТ **Аляксандр Міско:**

– Сумоўе прайшло даволі прадуктыўна. Мне паказалі моманты ў рэзюмэ, якія трэба дапрацаваць, далі рэкамендацыі, у якіх напрамках я магу атрымаць дадатковыя веды, каб вырасці як спецыяліст, параілі падняць свой узровень англійскай мовы. Мы з рэкрутарам абмяняліся кантактамі і дамовіліся, што праз чатыры месяцы ён даведаецца пра мае вынікі, – дзеліцца малады чалавек і займае чаргу на сумоўе да другога спецыяліста. У Аляксандра ёсць час, каб прааналізаваць досвед папярэдняга інтэрв’ю і падкарэкціраваць сваю прэзентацыю. Вынік уражлівы – спрабуючы прайсці сумоўе ў другі раз, ён робіць уражанне на рэкрутара, і той гатовы разгледзець яго як кандыдата на пазіцыю Junior у кампанію:

– У выпадку з Аляксандрам у мяне было адчуванне паўнавартаснага сумоўя, таму што чалавек прыйшоў падрыхтаваны ва ўсіх адносінах. Мне вельмі спадабалася, як было структуравана рэзюмэ, яго было камфортна праглядаць падчас сумоўя, што важна, калі ўлічваць, што азнаёміцца з інфармацыяй загадзя не было магчымасці. Яшчэ малады чалавек адразу ж абмаляваў свае моцныя і слабыя бакі, выказаў жаданне, як ён, уласна, хоча развівацца і якія ў яго для гэта ўжо ёсць навыкі, а таксама здольнасці, што ён ужо вывучыў і ўмее, – каментуе **Ірына Аніскевіч,** спецыяліст па падборы персаналу кампаніі «ТПК-Софт». – Насамрэч, я прыемна ўражана, таму што студэнты прыйшлі на сумоўе вельмі падрыхтаваныя, упэўненыя, яны рознабакова развітыя, многія з іх разумеюць, куды хочуць рухацца, з чым хочуць працаваць, і ўжо маюць адпаведныя навыкі. Праўда, некаторыя дапускалі памылкі падчас інтэрв’ю, напэўна, блытала хваляванне: забывалі прадстаўляцца і адразу пачыналі казаць пра сябе, прыносілі з сабой рэзюмэ, але забывалі аддаць яго. Яшчэ адзначу такі момант, што не ўсе выпускнікі вызначыліся, на якую менавіта вакансію яны прэтэндуюць. Калі спрабуеш канкрэтызаваць, адказваюць, што ім і тое цікава, і гэта, чакаюць, калі ім штосьці прапануюць. На рэальным сумоўі такія рэчы ці наўрад ці спрацуюць, таму трэба выразна разумець, што ты шукаеш, чаго хочаш, што можаш для гэтага зрабіць і што можаш даць кампаніі.

Практыкум ужо прайшлі студэнты ФФСН, ФРКТ, эканамічнага і біялагічнага факультэтаў. І калі пакуль не ўсе з іх атрымалі прапановы ад працадаўцаў, то ўсе сапраўды ведаюць, з чаго пачынаць пошук працы і пабудову сваёй кар’еры. Неўзабаве заняткі па працаўладкаванні распачнуць студэнты гістарычнага факультэта і ФСК. Інфармацыю пра правядзенне практыкума на іншых факультэтах можна даведацца ў дэканатах.

Валерыя БАНДАРЧЫК

МАНІТОРЫНГ

Садавіна будзе на ўсіх аб’ектах харчавання БДУ

У рамках працы грамадскай камісіі па кантролі за якасцю харчавання БДУ 2 сакавіка былі абмеркаваны вынікі вывучэння меркавання студэнтаў па задаволенасці арганізацыяй харчавання і працай аб’ектаў харчавання (сталовыя, буфеты, кіёскі, кафетэрыі) РВУП «Камбінат грамадскага харчавання БДУ».

На працягу студзеня–лютага 2018 года былі праведзены маніторынгі пасродкам: анлайн-апытанняў (інтэрнэт-рэсурсы), анкетных апытанняў, уключанага і няўключанага назіранняў, рэспандэнтамі якіх выступілі навучэнцы БДУ. Асноўныя крытэрыі ацэнкі: асартыментны пералік (1-я, 2-я, дыетычныя стравы і інш.), цана/кошт і якасць страў, сталовыя прыборы, посуд, порцыі, праца персаналу, культура абслугоўвання, графік/рэжым працы аб’екта харчавання і інш.

Прапановы і заўвагі, якія паступілі ад навучэнцаў, былі прааналізаваны і агучаны на камісіі.

Па выніках пасяджэння 6 сакавіка ў фармаце адкрытага дыялогу адбылася сустрэча прафсаюзнага актыву: старшыняў прафбюро і адказных за дадзены напрамак у навучальных падраздзяленнях БДУ з дырэктарам РВУП «КГХ БДУ» **Жаннай Варанкевіч**.

Па бягучай працы сталовых і буфетаў РВУП «КГХ БДУ» былі прыняты наступныя рашэнні:

• на ўсіх аб’ектах харчавання ў меню з’явіцца садавіна;

• у буфетах біялагічнага і гістарычнага факультэтаў у асартыментны пералік будуць уведзены супы;

• у буфетах ФРКТ і біялагічнага факультэтаў будуць уведзены пластыкавыя кантэйнеры для ежы;

• у сталовай ФРКТ павялічыцца асартымент гарніраў і салатаў;

• на гістарычным факультэце будзе працягнуты рэжым працы буфета да 17:00;

• на факультэце міжнародных адносін будзе павялічаны асартымент страў;

• на залах у буфеце біялагічнага і юрыдычнага факультэтаў усталююць бойлеры для нагрэву вады;

• у сталовай № 9 з персаналам будзе прапрацавана пытанне па павелічэнні страў у другой палове дня, штат укамплектаваны, пытанне ў абслугоўванні будзе вырашана.

Практыка сустрэч у дадзеным фармаце будзе працягнута.

Паводле інфармацыі прафкама студэнтаў БДУ

Фота Сяргея ШАФАЛОВІЧА

У студэнцкім кафэ «Гаудэамус» на Кальварыйскай, 9 з 16 сакавіка у меню з’явілася садавінва

ЮБІЛЯРЫ

Парадоксы сучаснай сацыялогіі

11 сакавіка вядомы беларускі вучоны, доктар сацыялагічных навук, прафесар кафедры сацыялогіі ФФСН **Ларыса Цітарэнка** адзначыла юбілей.

Ларыса Рыгораўна – лаўрэат навуковай прэміі імя У. І. Пічэты (2009), заслужаны работнік БДУ (2013).

За яе плячыма вялікі шлях у навуцы і, па сутнасці, сусветнае прызнанне. Л. Р. Цітарэнка з'яўляецца ганаровым членам Міжнароднага таварыства адукацыі, мае заахвочванні ад Міжнароднай сацыялагічнай асацыяцыі, Міжнароднага інстытута сацыялогіі. Член рэдкалегіі і эксперт міжнародных часопісаў Social Space, Nationalities, Wagadu, Limes, International Sociology, італьянскага серыйнага выдання Studies on Europe and on the Global Society, расійскага «Часопіса сацыялогіі і сацыяльнай антрапалогіі», украінскага часопіса «Соціологічні студії» і рэдкалегіі маніторынгу Інстытута сацыялогіі НАН Украіны, а таксама навуковага часопіса БДУ «Сацыялогія».

Сфера навуковых інтарэсаў прафесара Л. Р. Цітарэнкі ўключае шмат сацыяльных праблем: моладзь, праца, выхаванне і адукацыя, каштоўнасці, экалогія, гендарная роўнасць, мадэрнізацыя і грамадзянская супольнасць. Тэмы даследаванняў таксама тычацца посткамуністычнай трансфармацыі, фарміравання грамадскай думкі, нацыянальнай ідэнтычнасці. Праблемамі працоўнай сферы займаецца з савецкага часу.

Л. Р. Цітарэнка мае вялікі досвед навуковай і педагагічнай працы за мяжой. Выкладала сацыялогію ў ЗША (1998–2000, 2006), Польшчы (2003–2005), Фінляндыі (2011–2012), больш за дзесяць гадоў дыстанцыйна вяла курс па сацыяльным кантролі на англійскай мове, сумесна з амерыканскім калегам прафесарам К. В. Літлам (SUNY). Ёю падрыхтаваны і апублікаваны аўтарскія курсы лекцый: «Гендарная сацыялогія», «Сацыялогія грамадскай думкі», «Сучасная заходняя сацыялогія», яна суаўтар падручнікаў, слоўнікаў, энцыклапедый па сацыялогіі ў Расіі і Беларусі. У 2000 г. выступала на навуковай секцыі пра жаночае лідарства Спецыяльнай сесіі ААН у Нью-Ёрку (даклад апублікаваны на англійскай мове асобным выданнем).

Прафесар Л. Р. Цітарэнка актыўна працуе ў навуцы. У савецкі час – лаўрэат Філасофскага таварыства СССР за найлепшую працу сярод маладых навукоўцаў, стыпендыят імя К. Маркса. У постсавецкі час двойчы атрымлівала стыпендыю Фулбрайта для даследаванняў у ЗША (1996, 2016), удзельнік міжнародных даследчых праектаў па Еўрапейскіх даследаваннях каштоўнасцяў, сацыялогіі працы, сацыялогіі моладзі, якасці жыцця, постсавецкай трансфармацыі, экалогіі, міграцыі і інш. Выканаўца і кіраўнік міжнародных і рэспубліканскіх навуковых праектаў, якія ажыццяўляліся па праграме INTAS, фонду «Капернік», 7-й Рамачнай праграме ЕС (FP-7), праектаў БРФФД, праектаў Міжнароднай фінансавай карпарацыі, Міжнароднага фонду электаральных даследаванняў, ЮНФПА, ЮНІСЕФ, Еўрапейскага парламента, Міністэрства адукацыі і НАН Беларусі. З'яўляецца нацыянальным каардынатарам па сувязях беларускіх навукоўцаў у галіне сацыяльных і гуманітарных навук з заходнімі навукоўцамі ў праграме Еўрасаюза «Гарызонт 2020», удзельнік чатырох праектаў па гэтай праграме (з 2008 г.).

Прафесар Л. Р. Цітарэнка – аўтар (суаўтар) больш чым 600 навуковых і навучальна-метадычных прац, выдадзеных на дзевяці мовах, у тым ліку 12 навучальных дапаможнікаў і 20 манаграфій. Апошнія па часе – сумесная манаграфія з А. А. Здравамыславаў Sociology in Russia (Palgrave, 2017), і літаральна да юбілею ў БДУ выходзіць новая манаграфія Л. Р. Цітарэнкі «Парадоксы і павароты сучаснай сацыялогіі».

Пад навуковым кіраўніцтвам прафесара Л. Г. Цітарэнкі абаронены 14 кандыдацкіх дысертацый па сацыялагічных навуках. У рамках праграмы «Эразмус» выкладала студэнтам і магістрам у Фінляндыі і Турцыі. Выступала з лекцыямі ў шматлікіх краінах.

Віншуем!

Аляксандр ДАНІЛАЎ,
загадчык кафедры сацыялогіі

З НАГОДЫ

Яркі прыклад служэння грамадству

Да 115-годдзя з дня нараджэння прафесара **Васіля Сцяпанава,** загадчыка кафедры філасофіі (1947–1979), прарэктара па навуковай рабоце БДУ (1962–1967)

Няўмольны бег часу, і застаецца ўсё менш тых людзей, хто асабіста ведаў В. І. Сцяпанава і каго ўводзіў ён у свет філасофіі. Аўтар гэтых радкоў меў гонар вучыцца ў Васіля Іванавіча ў аспірантуры (1968–1971), затым працаваць на яго кафедры, быць намеснікам па навуковай рабоце.

Васіль Іванавіч нарадзіўся 13 сакавіка 1903 г. у сяле Залатое Саратаўскай вобласці ў сялянскай сям'і. З юнацкіх гадоў ён звязаў сваё жыццё з камсамолам, партыяй бальшавікоў. Захоплена прыняў Кастрычніцкую рэвалюцыю і абараняў яе ідэалы на франтах Грамадзянскай вайны. З 20 гадоў ён у шэрагах кампартыі, у 1929 г. накіроўваецца на вучобу ў Акадэмію камуністычнага выхавання імя Н. К. Крупскай, дзе атрымаў філасофскую адукацыю, якую працягнуў у аспірантуры акадэміі. У 1935 г. В. І. Сцяпанаў абараніў кандыдацкую дысертацыю, прысвечаную даследаванню светапогляду М. Г. Чарнышэўскага.

З 1935 г. В. І. Сцяпанаў загадчык кафедры філасофіі, дэкан гістарычнага факультэта і прарэктар па навуковай рабоце Сталінградскага педінстытута. Да 1944 г. на выкладчыцкай працы ў Вышэйшым ваенным зенітным вучылішчы, затым у дзейным войску – лектар палітаддзела 1-й Гвардзейскай танкавай арміі, удзельнічае ў вызваленні Беларусі, Польшчы, Германіі, у Берлінскай аперацыі. За баявыя заслугі адзначаны ордэнам Чырвонай Зоркі і баявымі медалямі. У паваенны час служба працягвалася ў групе савецкіх войскаў у Германіі.

У 1947 г. па ініцыятыве сакратара ЦК КП(б)Б, філосафа, члена-карэспандэнта АН СССР М. Т. Іаўчука Васіль Іванавіч быў дэмабілізаваны з арміі і пачаў працаваць у Беларускім дзяржаўным універсітэце, дзе ўзначаліў агульнаўніверсітэцкую кафедру

В. І. Сцяпанаў, 1961 г.

філасофіі, якой кіраваў да мая 1979 г. В. І. Сцяпанаў зрабіў значны ўнёсак у падрыхтоўку філасофскіх кадраў і развіццё філасофіі ў Беларусі. Ім былі напісаны цікавыя для свайго часу працы па філасофскіх перакананнях М. В. Ламаносава, рускіх рэвалюцыйных дэмакратаў (В. Бялінскага, А. Герцэна, М. Дабралюбава, М. Чарнышэўскага). Пры яго ўдзеле была апублікавана ў Маскве калектыўная манаграфія беларускіх філосафаў пад назвай «Пра «Філасофскія сшыткі» У. І. Леніна» (1959). Высокую ацэнку філасофскай грамадскасці атрымлівае і манаграфія Васіля Іванавіча «Філасофскія і сацыялагічныя погляды В. Р. Бялінскага» (1959), па матэрыялах якой у 1960 г. ён абараняе доктарскую дысертацыю. У 1961 г. яму было прысвоена званне прафесара.

З 1962 па 1967 гг. прафесар В. І. Сцяпанаў – прарэктар па навуковай рабоце БДУ. Ён з'яўляўся членам камітэта па Ленінскіх прэміях у галіне навукі і тэхнікі пры Савеце Міністраў СССР (1962–1966), членам рэдкалегіі часопісаў «Камуніст Беларусі», «Веснік БДУ, серыя III», членам рэдакцыйнага савета 12-томнай «Беларускай савецкай энцыклапедыі». Быў заўсёды цікавы і запатрабаваны як выдатны лектар таварыства «Веды», нягледзячы на вялікую занятасць увесь час выступаў сярод насельніцтва і ў працоўных калектывах рэспублікі.

Цесныя і плённыя адносіны звязвалі Васіля Іванавіча з Інстытутам філасофіі і права АН БССР, дзе ажыццяўляў навуковае кіраўніцтва аспірантаў. Пры яго ўдзеле выдадзены сумесныя працы выкладчыкаў узначаленай ім кафедры і супрацоўнікаў інстытута: «Дыялектычны матэрыялізм як метадалогія прыродазнаўчанавуковага пазнання» (1965); «Сацыяльныя змены працоўнага класа Беларусі» (1965); «Структура савецкай інтэлігенцыі» (1970) і інш. У 1967 г. ён быў абраны членам-карэспандэнтам Акадэміі навук БССР.

Пад кіраўніцтвам В. І. Сцяпанава ўніверсітэцкай кафедрай філасофіі былі напісаны буйныя манаграфіі. Сярод іх асаблівае месца займае праца «Пытанні дыялектычнага матэрыялізму» (1976). Высокую ацэнку савецкіх філосафаў атрымала яго праца сумесна з філосафамі Енскага ўніверсітэта (ГДР). Васіль Іванавіч быў адным з аўтараў кнігі «Грамадства супраць чалавека: Крытыка антыгуманнай сутнасці сучаснага капіталізму» (1983), якая была выдадзена ўжо пасля яго смерці.

Прафесар В. І. Сцяпанаў – аўтар больш чым 100 навуковых прац. Пад яго кіраўніцтвам падрыхтаваны 4 доктарскія і больш за 30 кандыдацкіх дысертацый. Яго вучні Д. І. Шыраканаў і Я. М. Бабосаў сталі акадэмікамі НАН Беларусі, а В. С. Сцёпін – акадэмікам РАН. Дактарамі навук сталі і многія супрацоўнікі кафедры філасофіі – Р. А. Левін, М. І. Жукаў, Ю. А. Гусеў, А. А. Міхайлаў, Я. В. Петушкова, П. С. Карака, Л. А. Гуцаленка, М. І. Вішнеўскі і інш.

Выпускнікі філасофскага аддзялення канца 1960-х – першай паловы 1970-х гг. А. І. Зелянкоў, Т. І. Адула, А. М. Байчораў, Т. П. Кароткая, С. П. Вінакурава, У. К. Лукашэвіч, Я. С. Яскевіч, Л. Ф. Кузняцова сталі дактарамі філасофскіх навук, некаторыя ўзначалілі кафедры ў ВНУ краіны.

Асабліва ставіўся Васіль Іванавіч да філасофскіх праблем прыродазнаўства. У аспірантуру кафедры былі прыняты выпускнікі прыродазнаўчых факультэтаў (А. А. Дудко, П. С. Карака, Н. К. Кісель, М. І. Вішнеўскі, А. І. Янчук). У наш час прафесар П. С. Карака, дацэнты А. А. Дудко, Н. К. Кісель і А. І. Янчук з'яўляюцца выкладчыкамі кафедры філасофіі і метадалогіі навукі. Прафесар Вішнеўскі доўгія гады быў першым прарэктарам Магілёўскага дзяржаўнага ўніверсітэта, а цяпер з'яўляецца загадчыкам кафедры філасофіі дадзенай ВНУ. Васіль Іванавіч сябраваў з акадэмікамі М. А. Ельяшэвічам, П. Ф. Ракіцкім і інш. Прадстаўнікі прыродазнаўчых навук часта выступалі з дакладамі на кафедры філасофіі.

За плённую навуковую дзейнасць і падрыхтоўку навуковых кадраў у 1977 г. В. І. Сцяпанаву прысвоена званне заслужанага дзеяча навукі БССР. Ён узнагароджваўся ордэнам Працоўнага Чырвонага Сцяга і Кастрычніцкай рэвалюцыі, шасцю Ганаровымі граматамі Вярхоўнага Савета БССР.

Дасведчаны педагог, даследчык і выхавальнік моладзі прафесар Васіль Іванавіч Сцяпанаў увасабляў у сабе найлепшыя якасці навукоўца. Ён валодаў велізарнымі ведамі не толькі ў галіне філасофіі, але і ў іншых галінах навукі і культуры. Асаблівую цікавасць выяўляў да мастацкай літаратуры, уважліва сачыў за творчасцю многіх айчынных літаратараў. Актыўна дзяліўся са сваімі слухачамі і суразмоўцамі асабістым разуменнем сацыяльных, эканамічных і культурных працэсаў краіны і сусветных праблем. Яго працавітасць, прынцыповасць, сціпласць, высокія маральныя рысы чалавека і грамадзяніна – яркі прыклад служэння грамадству.

Памёр В. І. Сцяпанаў на 77 годзе жыцця 22 мая 1979 г. Памяць пра яго як буйнога вучонага, клапатлівага выхавальніка і патрыёта сваёй краіны захоўваецца ў сэрцах усіх, хто меў гонар слухаць яго лекцыі, атрымліваў парады па даследаваннях і проста размаўляў з ім.

Прафесар Пётр КАРАКА,
доктар філасофскіх навук

Адзін за адным

Студэнты геаграфічнага факультэта Аляксандр Саладуха, Ірына Зелянкова, Таццяна Карват, Алена Карпенка, Валерый Караян

Дар'я Андрэева, Лізавета Сідарцова, ФМА

Ганна Міхнюк, вядучы бібліятэкар

Завяршылася літаратурная эстафета БДУ

Шмат відэа gazeta.bsu.by

Літаратурная эстафета БДУ, якую распачаў філалагічны факультэт, доўжылася з лістапада мінулага года. Апошняе відэа пабачылі ад ваеннага факультэта ў Міжнародны жаночы дзень. За ўвесь час 22 установы БДУ – факультэты, інстытуты, Фундаментальная бібліятэка – прадставілі 30 твораў беларускай літаратуры ў падтрымку рэспубліканскага конкурсу «Чытаем па-беларуску».

У рэспубліканскім конкурсе «Чытаем па-беларуску з velcom», які скончыцца толькі ў маі, удзельнічаюць школьнікі 7–8 класаў. Вучні запісваюць відэа, дзе чытаюць творы беларускіх класікаў. У падтрымку гэтай ініцыятывы Беларускі дзяржаўны ўніверсітэт запусціў сваю эстафету чытанняў, пачатак якой быў прымеркаваны да дня нараджэння Якуба Коласа, 3 лістапада. На першым этапе творы чытаў філалагічны факультэт. Далей па чарзе астатнія навучальныя структуры ВНУ далучыліся да гэтага праекта. У студэнтаў з'явіўся сапраўдны спартыўны азарт. Адзначым, што больш за 100 асоб прамільгнулі ў кадры за ўвесь час акцыі. Ролікі запісвалі студэнты самі альбо пры падтрымцы Медыяцэнтра БДУ ці Студэнцкага тэлебачання. Відэаролікі размяшчаліся ў сацыяльных сетках універсітэта.

У відэаролiках можна сустрэць вершы такіх аўтараў, як Якуб Колас, Янка Купала, Максім Багдановіч, Ніл Гілевіч, Сяргей Грахоўскі, Рыгор Барадулін, Пімен Панчанка, Анатоль Вярцінскі, Уладзімір Караткевіч, Алесь Разанаў, Аркадзь Куляшоў, Алесь Ставер. Акрамя гэтага студэнты ФМА прачыталі выбраныя санеты Шэкспіра ў перакладзе Уладзіміра Дубоўкі, а слухачы ФДА – народную песню «Прыехала Каляда на белым кані…». Інстытут тэалогіі імя святых Мяфодзія і Кірыла агучыў радкі з перакладзенага на сучасную беларускую мову Новага Запавета. Сярод тых, хто працаваў над перакладам, вызначаецца першы прарэктар Інстытута тэалогіі протаіерэй Сергій Гардун. На пераклад з арыгіналу – са старажытнагрэчаскага тэксту – пайшло 25 гадоў. Прэзентацыя Кнігі адбылася ў 500-годдзе беларускага кнігадрукавання.

Пашчасціла не толькі адчуць прыгажосць і мілагучнасць роднай беларускай мовы, але і пазнаць тыя праблемы і пытанні, якія ўздымаліся ў творах. Прагучалі думкі пра сэнс жыцця, шчасця і кахання, паглыбіліся ў сямейную тэматыку, перадалі стаўленне аўтараў да прыроды, радзімы і гісторыі, сказалі, што значыць творчасць і сіла духу.

Адзначым, што сёлетні 2018 год аб'яўлены годам малой радзімы. Гэта тэма таксама гучала ў эстафеце. На гэты конт сваім меркаваннем дзеліцца студэнт фізічнага факультэта **Дзмітрый Крэйдзіч:**

– Мне спадабалася ідэя эстафеты. Лічу гэта вельмі цікавым праектам, бо такім чынам мы папулярызуем беларускую мову і літаратуру. Раней у такіх акцыях не ўдзельнічаў. Я прадстаўляў верш Алеся Ставера «Жураўлі на Палессе ляцяць». Чаму абраў гэты твор? Ён мне блізкі, таму што сам нарадзіўся на Палессі. На мяне нават накаціла настальгія. Яшчэ раз для сябе адзначыў, якая наша прырода асаблівая і як гэта правільна падкрэсліваецца ў вершы. Падчас рэпетыцый, запісу кадраў я прапускаў праз сябе гэтыя радкі зноў і зноў, і, мне здаецца, тады я і зразумеў сэнс гэтага верша. Пасля выхаду ролiка мае знаёмыя выказвалі станоўчыя водгукі.

Некаторыя замежныя студэнты таксама прынялі ўдзел у чытанні. Да гэтага з беларускай мовай сутыкацца ім даводзілася рэдка. Напрыклад, студэнт Міжнароднага дзяржаўнага экалагічнага інстытута імя А. Сахарава Абдала Давуд, чыя радзіма Саудаўская Аравія, кажа, што вельмі доўга рыхтаваўся да чытання вершаў на беларускай мове, яго падтрымлівалі блізкія людзі. Але падчас запісу ролiка ён не хваляваўся, таму што вопыт выступленняў са сцэны ў яго быў.

Ганна Міхнюк, вядучы бібліятэкар:

– Мы, супрацоўнікі Фундаментальнай бібліятэкі, вырашылі далучыцца да акцыі адразу, як толькі пра яе пачулі. Марафон проста выдатны, ідэя вельмі добрая! Вядома, каму як не нам, бібліятэкарам, чытаць вершы? Вельмі доўга выбіралі твор. Браць лірыку нашых беларускіх класікаў або штосьці праніклівa патрыятычнае? Ці закрануць нашу прафесійную тэматыку? Пра любоў да кнігі, напрыклад? Усім сектарам бібліятэчнага маркетынгу чыталі ўголас, каб зразумець, якія вершы прыгажэй гучаць, калі іх будуць чытаць некалькі чалавек. Потым вылучылі верш П. Панчанкі «Родная мова» і падабралі каманду з 5 дзяўчат. Уражанні ад здымак ролiка засталіся самыя станоўчыя, нам вельмі спадабалася! На памяць застаўся не толькі сам відэаролік, але і вясёлае відэа «бэкстэйдж». Лічу, што ўдзел у падобных праектах вельмі збліжае (мы супрацоўнікі розных аддзелаў бібліятэкі), таксама гэта выдатная магчымасць праявіць сябе і выказаць любоў да сваёй роднай мовы, а яшчэ гэта дазваляе адчуць сябе часткай вялікай дружнай каманды БДУ.

Алена ЛЯЎШЭНЯ

Ягор Лабажэвіч, ваенны факультэт

Дзмітрый Крэйдзіч, фізічны факультэт

Лі Фан, Андрэй Іанчарэнка, факультэт даўніверсітэцкай адукацыі

Марыя Арыніч, хімічны факультэт

Святлана Салагубава, Мікалай Румаў, Яўгенія Красніцкая, ММФ

Дзіяна Рыжэвіч, Фундаментальная бібліятэка

СТУДЭНЦКІ ІНТАРЭС

Пачатак вясны для ўсёй юрыдычнай супольнасці Беларусі і для юрыдычнага факультэта БДУ па традыцыі адзначаецца правядзеннем самага маштабнага спаборніцтва сярод студэнтаў прававых спецыяльнасцяў з усіх установ вышэйшай адукацыі краіны. 2 сакавіка юрыдычны факультэт БДУ з гонарам адчыніў свае дзверы партнёрам, гасцям і ўдзельнікам вочных тураў Беларускай студэнцкай юрыдычнай алімпіяды – 2018, вядучым араганізатарам якога з'яўляецца Міністэрства адукацыі Рэспублікі Беларусь.

У авангардзе Феміды

Больш фота gazeta.bsu.by

За выхад у вочныя туры змагалася 15 УВА (18 каманд і 124 індывідуальныя ўдзельнікі). Права прымаць удзел у вочным туры Алімпіяды–2018 атрымалі 12 каманд і 52 індывідуалы.

На ўрачыстай цырымоніі адкрыцця Алімпіяды–2018 быў традыцыйна прадстаўлены відэаролік, што адлюстраваў развіццё алімпійскага руху на працягу 14 гадоў. Мерапрыемства адкрыў дэкан юрыдычнага факультэта прафесар **Сяргей Балашэнка**: «Гэтая студэнцкая алімпіяда чатырнаццатая ў гісторыі нашай Бацькаўшчыны. Наступная будзе юбілейнай, таму трэба будзе рыхтавацца яшчэ лепш і старанней. De jure у нас ужо надышла вясна, але de facto яна надыдзе толькі пасля Беларускай студэнцкай юрыдычнай алімпіяды! І можаце быць упэўненыя, скончыцца алімпіяда – прыйдзе вясна!»

Прафесар **Вольга Чупрыс**, прарэктар БДУ па вучэбнай рабоце і адукацыйных інавацыях, адзначыла: «Беларуская студэнцкая юрыдычная алімпіяда ўжо 14 гадоў з'яўляецца прыкладам пераходу ад звычайнай трансляцыі ведаў да творчага, індывідуальнага і нестандартнага мыслення. Юрыдычная алімпіяда – адно з самых значных мерапрыемстваў Міністэрства адукацыі. Беларуская адукацыя ідзе па правільным шляху, па шляху, арыентаваным на моладзь, па шляху самарэалізацыі і развіцця творчых здольнасцяў».

Вадзім Іпатаў, дырэктар Нацыянальнага цэнтра заканадаўства і прававых даследаванняў Рэспублікі Беларусь, заўважыў: «Тут сабраліся тыя, хто жыве правам, разумее яго філасофію, тыя, хто будзе папулярызаваць прафесію юрыста ў будучыні. Жадаю поспехаў як удзельнікам, так і журы. Пераможаных не будзе, таму што кожны здабудзе званне!»

Мікалай Старавойтаў, намеснік міністра юстыцыі Беларусі, у першую чаргу адзначыў важнасць работы журы: «Ім, можа, нават складаней, чым вам, удзельнікам, таму што выбраць пераможцаў не так проста. Спадзяюся, што вы ўзброіліся ведамі, і жадаю праявіць сябе толькі з найлепшага боку!»

Вячаслаў Абрамаў, намеснік старшыні Дзяржаўнага камітэта па маёмасці, сказаў: «Хочацца павіншаваць з пачаткам цікавага і яркага этапу студэнцкага жыцця. Вы ўсе чакалі гэтага і рыхтаваліся на працягу года. Сёння і заўтра вы атрымаеце своеасаблівы вопыт і ўразіце сваімі ведамі журы. Жадаю ўсім складаных задач і цікавых рашэнняў».

Дзяніс Туравец, кіруючы партнёр адвакацкага бюро «Ягораў, Пугінскі, Афанасьеў і партнёры», таксама выступіў з прамовай: «Мы даўно сочым за правядзеннем юрыдычнай Алімпіяды, таму можам сказаць, што вы павінны прывучаіцца глядзець на ўсё з аптымізмам і прыняць удзел у алімпіядзе за новую магчымасць паказаць сябе. Жадаю вам упэўненасці, запалу і куражу».

Сяргей Каліноўскі, адвакат Мінскай гарадской калегіі адвакатаў: «У першую чаргу хачу сказаць, што вы ўсе пераможцы, таму што прайшлі ў вочны тур. Дакажыце самі сабе, што вы можаце дасягнуць поспехаў у рэальных абставінах. І хачу параіць: калі ў вас ёсць добрыя доказы, бярыце фактамі; калі разумееце нормы закона, то карыстайцеся імі; а калі няма ні таго, ні другога, то бярыце голасам».

Сутнасць заданняў

У вочных турах ***індывідуальным удзельнікам*** было прапанавана падрыхтаваць 2 праекты прававпрымяняльных актаў; адказ на ліст грамадзяніна; экспертнае заключэнне праекта нарматыўнага прававога акта; тэставае заданне.

У ***камадных спаборніцтвах*** трэба было выканаць наступныя заданні: аналіз казусу і падрыхтоўка прэзентацыі пазіцыі па грамадзянскай (гаспадарчай) справе ў судзе другой інстанцыі; падрыхтоўка экспертнага заключэння праекта нарматыўнага прававога акта; падрыхтоўка 2 праектаў прававпрымяняльных актаў; інтэрв'юіраванне і падрыхтоўка пісьмовай кансультацыі натарыуса на беларускай мове (спецыялізаваны конкурс Беларускай натарыяльнай палаты); прэзентацыя пазіцыі па грамадзянскай (эканамічнай) справе ў судзе; падрыхтоўка пісьмовай кансультацыі натарыуса (спецыялізаваны конкурс Беларускай натарыяльнай палаты); адказ на ліст грамадзяніна (спецыялізаваны конкурс Беларускай натарыяльнай палаты).

Карыстацца сродкамі электроннай сувязі было строга забаронена. За гэтым сачылі выкладчыкі і студэнты з арганізацыйнага камітэта.

Журы складалася з 2 калегій: па грамадзянскіх і па крымінальных справах. У значаліў журы конкурсу Валерый Калінковіч, першы намеснік Старшыні Вярхоўнага Суда Рэспублікі Беларусь;

Конкурсная праграма першага дня завяршылася ў 18.30. А ўжо 3 сакавіка ў 9.00 журы абвесцяла 16 удзельнікаў-фіналістаў індывідуальнага заліку і 6 фіналістаў камандnага заліку.

У фінальных турах удзельнікі павінны былі на падставе аналізу казуса прэзентаваць пазіцыю па грамадзянскай (для індывідуалаў) і крымінальнай (для каманд) справе.

На ўрачыстым закрыцці з прадмовай выступіў намеснік Кіраўніка Адміністрацыі Прэзідэнта Рэспублікі Беларусь **Валерый Міцкевіч**: «Праводзіць юрыдычную алімпіяду стала традыцыяй. Усе студэнты юрыдычных спецыяльнасцяў, якія праявілі сябе падчас Алімпіяды, цяпер працуюць у Следчым камітэце, Генеральнай пракуратуры і судах. І гэта радуе, таму што найлепшыя з лепшых знаходзяць сваё прызванне ў адпаведнасці з іх прафесіяй. Канешне, шмат працы ў правядзенне алімпіяды ўкладзена арганізацыйным камітэтам, старшынёй якога з'яўляецца дэкан юрыдычнага факультэта, доктар юрыдычных навук, прафесар Сяргей Аляксандравіч Балашэнка».

Валерый Міцкевіч ад імя Адміністрацыі Прэзідэнта Рэспублікі Беларусь узнагародзіў **Сяргея Балашэнку** ***Ганаровай граматай*** за шматгадовую арганізацыю Беларускай студэнцкай юрыдычнай алімпіяды і актыўнае ўкараненне інавацыйных і практыка-арыентаваных тэхналогій у адукацыйны працэс.

Вадзім Богуш, першы намеснік міністра адукацыі Беларусі, дадаў: «Гэтыя 2 дні алімпіяды былі напружанымі з пункта погляду эмоцый і інтэлектуальнай дзейнасці. Мне хочацца павіншаваць усіх з перамогай, таму што, нягледзячы на ваша месца ў рэйтынгу, вы ўсе набылі вялікі вопыт».

Пераможцы

У індывідуальным заліку Алімпіяды–2018 месцы размеркаваліся наступным чынам:

1 месца – **Слінько Кацярына** (Акадэмія кіравання пры Прэзідэнце Рэспублікі Беларусь).

2 месца – **Супрун Святлана** (Гомельскі дзяржаўны ўніверсітэт імя Ф. Скарыны).

3 месца – **Глухаў Аляксей** (БДУ); **Чарнякова Кацярына** (БДУ); **Паторская Алена** (БДУ).

У камандным заліку Алімпіяды –2018 пераможцамі сталі:

1 месца – **«Авангард Феміды»** (БДУ).

2 месца – **«Купалаўцы»** (ГрДУ імя Я. Купалы).

3 месца – **«Дума»** (БДУ); «Акадэміус» (АКПРБ).

У спецыялізаваным конкурсе Беларускай натарыяльнай палаты перамаглі:

1. «Купалаўцы» – ГрДУ імя Я. Купалы.

2. «Авангард Феміды» – БДУ.

3. VitaVinatus – БІП – Інстытут правазнаўства.

Усе пераможцы алімпіяды адзначаны дыпломамі Міністэрства адукацыі, узнагароджаны каштоўнымі прызамі, а таксама будуць уключаны ў спецыяльны фонд Прэзідэнта Рэспублікі Беларусь па сацыяльнай падтрымцы адораных навучэнцаў і студэнтаў. Таксама пераможцы былі адзначаны спецыяльнымі прызамі партнёраў: ГА «Беларускі рэспубліканскі саюз юрыстаў», Генеральнай пракуратуры Беларусі, Вярхоўнага Суда РБ, Следчага камітэта, Дзяржаўнага камітэта па маёмасці, Нацыянальнага цэнтра прававой інфармацыі, ТАА «Юрспектр», АБ «Сысуеў, Бондар, Храпуцкі СБХ». Традыцыйна партнёры ўручылі некаторым удзельнікам сертыфікаты на праходжанне месячнай аплочваемай стажыроўкі.

Меркаванні

На працягу ўсяго мерапрыемства госці і партнёры выказвалі свае меркаванні наконт правядзення Алімпіяды.

Сяргей Аземша, намеснік старшыні Следчага камітэта Рэспублікі Беларусь, генерал-маёр юстыцыі, запэўніў, што ўсе ўдзельнікі алімпіяды – мэтанакіраваныя людзі, у якіх атрымаецца рэалізаваць свае здольнасці і веды ў юрыдычнай сферы.

Андрэй Рашчупкін, першы намеснік генеральнага дырэктара замежнага прадпрыемства «Кока-Кола Беўрыджыс Беларусь»: «Удзел у алімпіядзе – гэта не проста пачатак, гэта ўжо крок наперад. Безумоўна, і камандам, і індывідуалам яшчэ ёсць над чым працаваць. Мы ўпэўнены, што ў наступным годзе ўсе ўдзельнікі максімальна папрацуюць над сваімі недахопамі і пакажуць лепшыя вынікі. Поспехаў!» Андрэй Валянцінавіч таксама адзначыў некаторыя складанасці ў прапанаваных удзельнікам казусах і ўручыў дэкану юрыдычнага факультэта сертыфікат на замацаванне матэрыяльна-тэхнічнай базы.

Сяргей Балашэнка падзякаваў арганізацыйнаму камітэту алімпіяды ў асобах намесніка дэкана юрфака Андрэя Шыдлоўскага і загадчыка кафедры тэорыі і гісторыі дзяржавы і права Сяргея Калініна, выкладчыкам, студэнтам, членам журы і партнёрам мерапрыемства.

Пасля ўрачыстай цырымоніі закрыцця абсалютныя пераможцы камандnага заліку, удзельнікі каманды юрыдычнага факультэта БДУ **«Авангард Феміды»** падзяліліся сваімі ўражаннямі:

«Усе тыя моманты, калі меркаванні разыходзіліся, калі спрачаліся па кожнай дробязі ў вырашэнні любой задачы, калі рыхтаваліся да позняга вечара, усё гэта – не дарма. Неабходна было паказаць, што юрыдычны факультэт БДУ – найлепшае месца для таго, каб стаяць сапраўдным юрыстам, і мы гэта зрабілі!» – сказаў капітан каманды **Уладзіслаў Каломенскі**. «Калі нас аб'явілі пераможцамі, то мы адчулі эмацыйны катарсіс, – дадае **Ірына Дзямідзік**.– Мы ўдзячны выкладчыкам за іх дапамогу ў падрыхтоўцы да алімпіяды. А сакрэт нашай зладжанай камандnай гульні просты: нам падабалася ўдзельнічаць і рыхтавацца да алімпіяды. Мы не разгубіліся і правільна размеркавалі ролі, кожны змог паказаць свае моцныя бакі. «Авангард Феміды» – прыклад падтрымкі, працавітасці і суладнай працы!»

Беларуская студэнцая юрыдычная алімпіяда – гэта не толькі захапляльнае спаборніцтва найлепшых студэнтаў юрыдычных спецыяльнасцяў, але і вялікі крок наперад да прафесійнага поспеху, да магчымасці пракласці свой кар'ерны шлях у юрыспрудэнцыі.

Арганізацыйны камітэт, госці і партнёры алімпіяды ад шчырага сэрца віншуюць усіх пераможцаў! Мы ганарымся вашымі талентамі і дасягненнямі. Няхай вашы зоркі, запаленыя сёння на юрыдычным небасхіле, гараць доўга і ярка!

Матэрыял падрыхтавалі
Андрэй ШЫДЛОЎСКІ,
намеснік дэкана юрыдычнага факультэта,
Аляксандр ФЕДАРОВІЧ,
старшыня каардынацыйнай групы студэнцкага актыву юрфака

ДОБРАЯ СПРАВА

Вольга Дайновіч з юрфака віншуе са святам Леаніда Цегіна

Цяпло сваіх рук падарылі студэнты ветэранам БДУ

Удзельнікі праекта «Цяпло тваіх рук» сумесна з упраўленнем выхаваўчай работы з моладдзю, Пярвічнай прафсаюзнай арганізацыяй работнікаў БДУ, саветам Беларускага грамадскага аб'яднання ветэранаў БДУ, цэнтрам добраахвотніцкай дзейнасці павіншавалі з Днём абаронцы Айчыны і Міжнародным жаночым днём кожнага ветэрана Вялікай Айчыннай вайны БДУ, парадавалі падарункамі і сваёй увагай, наведаўшы іх.

Падчас сустрэч студэнты пагутарылі з ветэранамі, падзякавалі за вялікі подзвіг і магчымасць жыць у міры і спакоі.

А напярэдадні святаў у рамках праекта «Цяпло тваіх рук» 19 лютага і 6 сакавіка валанцёрамі фізічнага факультэта сумесна з цэнтрам добраахвотніцкай дзейнасці БДУ і прафкамам работнікаў былі арганізаваны майстар-класы па вырабе чахлоў з фетру (для акуляраў, тэлефонаў і інш.) і дэкаратыўных ваз.

Зробленыя падарункі былі ўручаны ветэранам. Студэнтам было вельмі прыемна бачыць іх пазітыўны настрой і ўсведамляць, што парадавалі іх сваім візітам, а цёплыя словы падзякі яшчэ доўга саграваліі ўсіх у халодную зацягнутую зіму.

Гэтыя святы разам з намі сустрэлі 19 ветэранаў Вялікай Айчыннай вайны: 12 мужчын і 7 жанчын.

Алена ГРЫШЫНА

У ВОЛЬНЫ ЧАС

Артыстызм, прыгажосць, пяшчота

Ва ўніверсітэце абрана «Каралева Вясна БДУ–2018»

Больш фота gazeta.bsu.by

Універсітэцкі этап міжнароднага міжуніверсітэцкага конкурсу грацыі і артыстычнага майстэрства «Каралева Вясна БДУ–2018» прайшоў 5 сакавіка. Больш за 50 студэнтак прыйшлі на кастынг, але магчымасць пазмагацца за карону і галоўны прыз атрымалі толькі 12 з іх: самыя артыстычныя, таленавітыя і адважныя.

«Каралевай Вясной БДУ–2018» стала Юлія Таран з біялагічнага факультэта

Падчас падрыхтоўкі ў раскладзе фіналістак не было вольнай хвілінкі: пастаянныя здымкі, майстар-класы, рэпетыцыі, падрыхтоўка да творчых выступленняў, дэфіле і многае іншае, кожнай прыйшлося адказваць на каверзныя пытанні інтэрв'ю.

Ва ўсіх былі свае прычыны паўдзельнічаць у конкурсе. На пытанне, чаму прыйшлі на кастынг, дзяўчаты адказвалі сумленна, распавядалі свае гісторыі:

Ларыса Надтачаева, фіналістка: «Я не задумвалася пра гэта раней. Цяпер сяджу і пачынаю ўзгадваць свае прычыны. Справа ў тым, што гадоў да 14 я чула пра сваю знешнасць не самыя прыемныя словы... У мяне былі праблемы са зрокам, зубамі, і многія лічылі сваім абавязкам сказаць, што я непрыгожая, брыдкая. Я адчувала цічк. Гэта дало нейкі імпульс да самаўдасканалення. Відаць, конкурс для мяне як пацвярджэнне таго, што я кінула выклік і пераадолела сябе».

Лізавета Саковіч, фіналістка: «Я наогул не планавала ўдзельнічаць, проста ўбачыла аб'яву, што будзе праходзіць кастынг на конкурс «Каралева Вясна БДУ», і стала цікава. Заўсёды хацела выпрабаваць сябе, паглядзець, як я буду спраўляцца са стрэсавымі сітуацыямі, да таго ж гэта новыя знаёмствы і эмоцыі».

Фінал адбыўся ў Ліцэі БДУ. Феерычнае шоу стала сапраўдным святам вясны, прыгажосці і пяшчоты. Перад пачаткам конкурсу рэктар БДУ **Андрэй Кароль** пажадаў удзельніцам перамогі і павіншаваў усіх дзяўчат і жанчын БДУ з надыходзячым святам.

Падчас фінальнага канцэрта дзяўчаты праявілі сябе з найлепшага боку. Не проста вытрымаць 3 дэфіле ў нацыянальных, дзелавых строях і ў вячэрніх сукенках, паказаць эрудыцыю і здольнасць хутка арыентавацца ў сітуацыі і годна выходзіць з яе ў інтэлектуальным конкурсе, адкрыць для ўсіх свой талент у творчым нумары.

Анастасія Гаўрылюк, фіналістка: «Што наконт творчага? Гэта атрымалася вельмі спантанна. Спачатку я думала рабіць малюнак. Потым мне здалося, што гэта недастаткова эфектна, і я вырашыла станцаваць. Калі я ўбачыла, як танчаць дзяўчаты, вырашыла, што танец – не маё. І за 5 дзён да конкурсу я вырашыла цалкам памяняць канцэпцыю.

Больш за ўсё мне спадабалася мая відэавізітоўка. Яна атрымалася вельмі кранальнай і душэўнай. Якраз як я і хацела. Я рабіла гэту візітоўку не для птушачкі, а хутчэй для сябе і для людзей, якія будуць глядзець. Бо шчасце трэба шукаць побач, а не ў нейкіх глабальных рэчах. Я спадзяюся, што людзі глядзелі не проста на прыгожы малюначак, а прыслухоўваліся да слоў. Я імкнулася ўкласці ўсю сваю душу ў гэтыя паўтары хвіліны».

Анастасія Ярмак, фіналістка: «З творчым нумарам атрымалася весела: я да апошняга вечара не ведала, што буду танчыць, і ўвечар наразала музыку да конкурсу. Але ж 12 гадоў бальных танцаў не прайшлі дарэмна. Потым я пачула захапляльныя водгукі пра сваё выступленне: «Насця, ты выдатная», «гэта было вау!». Дэфіле для мяне было самым лёгкім, таму што дэфіляваць я люблю і даўно ўмею. Вось з відэа прыйшлося павазіцца, бо гэта справа няпростая. Мы здымалі, рэзалі музыку, думалі – і вось усё зрабілі за 3 дні. На інтэлектуальным конкурсе мне трапілася цікавае і нескладанае пытанне, на якое я проста і зразумела адказала».

І вось – узнагароджанне. Журы прыйшлося прыняць нялёгкія рашэнні, і старшыня журы, прарэктар БДУ **Іван Янушэвіч**, выйшаў на сцэну, каб узнагародзіць самых таленавітых, прыгожых і артыстычных. Так, *«Каралевай грацыі»* стала першакурсніца **Анастасія Ярмак**, тытулы *«Каралева таленту»* і «Каралева інтэлекту» заваявалі другакурсніцы факультэта сацыякультурных камунікацый **Анастасія Гаўрылюк** і **Ларыса Надтачаева** адпаведна, у намінацыі *«Каралева фота»* перамагла магістрантка юрыдычнага факультэта **Лізавета Швакава**. Па выніках анлайн-галасавання ў намінацыі *«Каралева глядацкіх сімпатый»* абралі першакурсніцу філалагічнага факультэта **Алу Валюк**.

На сцэне яшчэ сем удзельніц, але толькі дзве атрымаюць самыя высокія тытулы, права прадстаўляць БДУ на гарадскім этапе конкурсу і галоўныя падарункі – выхадны тур у Львоў і падарожжа па Еўропе. Хваляванне, інтрыга – і *«Віцэ-каралевай Вясной БДУ»* становіцца студэнтка біялагічнага факультэта **Вераніка Цубікава**.

Пасля невялікай паўзы прарэктар Іван Янушэвіч узяў слова і абвясціў, якая дзяўчына прызнана самай прыгожай і таленавітай у Беларускім дзяржаўным універсітэце: *«Каралевай Вясной БДУ–2018»* становіцца **Юлія Таран**, студэнтка першага курса біялагічнага факультэта!»

«Да моманту ўзнагароджання эмоцыі ўжо суцішыліся, – дзеліцца ўражаннямі Юлія. – Усё ў памяці мільгае яркімі карцінкамі: дзяўчаты-прынцэсы з кветкамі, яркае святло і тая атмасфера, зусім і не хвалюючая. І вось пачынаецца ўзнагароджанне, я вельмі спадзявалася на «Каралеву фота». У выніку ж, калі засталіся 2 самыя важныя намінацыі, у галаве на секунду пранеслася: «А можа быць, я Віцэ-каралева? Знерваваўшыся, што я не атрымала зусім нічога, я пачала думаць, на якім аўтобусе цяпер сумная паеду дахаты. Але застаецца апошні дыплом, і я чую за спінай: «Юля, гэты ты!» Далей усё як у тумане: зала, якая скандавала маё прозвішча, мае раптоўныя слёзы і цудоўныя сябры (думала, што не выберуся з іх бясконцых абдымкаў). Тысяча віншаванняў і фатаграфій, а я дагэтуль не магу зразумець, што толькі што адбылося. Пры падрыхтоўцы было вельмі складана, але я старалася зусім не дзеля перамогі, я паўтарала сабе кожны дзень: «Я змагу справіцца з гэтым нялёгкім выпрабаваннем». Далей будзе яшчэ складаней, бо нас чакае гарадскі конкурс, але, паверце, біяфак яшчэ вас здзівіць! Дзякуй БРСМ БДУ за радасныя эмоцыі і цудоўнае свята!»

Анастасія ЛАРЫНА

УНІВЕРСІТЭТ
Выдаецца з 1929 года

Заснавальнік газеты – Беларускі дзяржаўны ўніверсітэт
Выданне зарэгістравана Міністэрствам інфармацыі Рэспублікі Беларусь.
Рэгістрацыйнае пасведчанне № 1082 ад 21 студзеня 2010 года

Падпісана да друку 16.03.2018 г.
Зак. 225. Тыраж 1000 экз.
Надрукавана на Дзяржаўным прадпрыемстве «БудМедыяПраект».
ЛП № 02330/71 ад 23.01.2014 220123, Мінск, вул. В. Харужай, 13/61.

Рэдактар Сяргей Сяргеевіч ШАФАЛОВІЧ
Карэктар Ганна Яўгенаўна РАК
Адрас рэдакцыі: 220030, Мінск, прасп. Незалежнасці, 4
Прыёмная: вул. Кальварыйская, 9, каб. 102, тэл. 259-70-77,
e-mail: gazeta@bsu.by; www.gazeta.bsu.by